1929/1930 школьны год.

# Віленская Беларуская Гімназія

**Васьмёхклясовая гімназія, гуманістычнага тыпу з беларускаю выкладоваю мовай,**

## з правамі урадовых польскіх гімназіяў.

Адкрыта прыймо заяваў у 1, 2, 3, 4, 5, 6 і 7 клясы, а ў 8-ую кл. вучні могуць быць прыняты толькі з дазволу Куратарыюму Віл. Шк. Вокр. Прымаюцца хлапцы і дзяўчаты.

УВАГА: тыя вучні-цы, якія пажадаюць перавесьціся ў Віленскую Беларускую Гімназію з другіх не беларускіх гімназій, павінны трымаць экзамен з беларускай мовы, гісторыі і географіі Беларусі ў абыйме папярэдніх клясаў.

УЗРОСТ ПАСТУПАЮЧЫХ: у I кл ад $9\frac{1}{2}$ да 12 гадоў, у II кл. $10\frac{1}{2}$—13, у III кл. $11\frac{1}{2}$—14 гад., у IV кл. $12\frac{1}{2}$—15 гад., у V кл $13\frac{1}{2}$—16 гад., у VI кл. $14\frac{1}{2}$—17 гад. і ў VII кл. $15\frac{1}{2}$—18 гад.

УВАГА: дзеля асобных абставінаў прымаецца пад увагу перарост паступаючых, але найбольш да 2-х гадоў.

УСТУПНАЯ ПЛАТА: кожны паступаючы, адначасна з просьбаю аб прыйме, незалежна ад клясы, у якую паступае, павінен унесьці ўступную плату ў канцэлярыю гімназіі ў разьмеры 10 зл.

ПЛАТА ЗА НАВУКУ: у I кл.—20 зл., у II кл.—30 зл., у III кл.—40 зл., у IV кл.—60 зл., у V кл.—70 зл., у VI кл.—80 зл., у VII кл.—90 зл., у VIII кл.—110 зл. **у паўгодкі.**

ЗАЯВЫ аб паступленьні ў гімназію прыймаюцца штодзенна (апрача субот і сьвят) ад 10-ай да 14-ай гадз. Заявы можна пасылаць і поштай, прыкладаючы паштовых марак на 25 гр. на адказ.

УВАГА: да заявы аб прыйме абавязкава трэба далучыць 1) мэтрыку аб нараджэньні, 2) пасьведчаньне доктара аб прышчэпе воспы і 3) пасьведчаньне аб папярэдняй адукацыі. Ад тых, якія паступаюць з хатняй падгатоўкай, вымагаецца, замест школьнага пасьведчаньне бацькоў, ці ксяндза або сьвяшчэньніка, аб тым, што вучыўся дома.

**Пачатак уступных экзаменау — 3-га верасьня.**

Пры гімназіі для жадаючых ёсьць інтэрнат з платай па 50 зл. у месяц. Тыя вучні, якія добра будуць вучыцца ў працягу І-ых паўгодкаў, могуць атрымаць стыпэндыю Дабрадзейнага Т-ва. Інтэрнат толькі для хлапцоў.

**Адрэс: г. Вільня, Востраабрамская вул. № 9.**

*Дырэкцыя Гімназіі.*



1929 / 1930 школьн. год

# Навагрaдзкая Беларуская Гімназія

**Васьмёхклясовая Гімназія прырода-матыматычнага тыпу з беларускаю выкладоваю мовай,**

**з правамі урадовых польскіх гімназіяў.**

Адкрыта прыймо заяваў у 1, 2, 3, 4, 5, 6 і 7 клясы, а ў 8-ую клясу вучні (-цы) могуць быць прыняты толькі з дазволу Куратарыюму Віл. Шк. Вокр. Прыймаюцца хлапцы і дзяўчаты.

УВАГА: Тыя вучні-цы, якія пажадаюць перавесьціся ў Навагрaдзкую Гімназію з другіх, небеларускіх гімназіяў, павінны трымаць экзамен з беларускае мовы, гісторыі і географіі Беларусі ў абыйме папярэдніх клясаў.

УЗРОСТ ПАСТУПАЮЧЫХ: у I кл. ад $9\frac{1}{2}$ да 12 гадоў, у II кл. $10\frac{1}{2}$—13 гадоў, у III кл. $11\frac{1}{2}$—14 гад., у IV кл. $12\frac{1}{2}$—15 гад, у V кл. $13\frac{1}{2}$—16 г., у VI кл. $14\frac{1}{2}$—17 гад. і ў VII кл. $15\frac{1}{2}$—18 г.

УВАГА: дзеля асобных абставінаў прыймаецца пад увагу перарост паступаючых, але ня больш як да 2-х гадоў.

Заявы аб паступленьні ў Гімназію прыймаюцца што дня. Заявы можна пасылаць і поштай, прыкладаючы паштовых марак на 25 гр. на адказ. Да заявы аб прыйме абавязкава трэба далучыць: 1) мэтрыку аб нараджэньні, 2) пасьведчаньне доктара аб прышчэпе воспы і 3) пасьведчаньне аб папярэдняй адукацыі. Ад тых, якія паступаюць з хатняй падгатоўкай, вымагаецца, замест школьнага пасьведчаньня, пасьведчаньне бацькоў, ксяндза ці сьвяшчэньніка аб тым, што вучыўся дома.

Усе падробныя інформацыі ў справе паступленьня можна атрымаць у канцэлярыі гімназіі. Адрэс:

**м. Наваградак, Беларуская Гімназія.**

**Дырэкцыя Гімназіі.**